УДК 94(47+57)"1941/45"+930(476)

***У.В. Здановіч***

*канд. гіст. навук, дац., заг. каф. гісторыі Беларусі*
*Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна*

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ПРАЦАХ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ (2010–2014 ГГ.)

*У артыкуле разглядаецца працэс вывучэння партызанскага руху ў вылучаны перыяд. Адзначаецца, што ў даследаванні дадзенай тэмы дасягнуты паэўныя вынікі. Пашырылася крыніцазнаўчая база, з'явіліся калектыўныя выданні, у якіх маюцца спецыяльныя раздзелы, прысвечаныя ўзброенай барацьбе насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Дадзеная праблема знайшла адлюстраванне ў манаграфіях, шэрагу артыкулаў. Вывучэнне гісторыі партызанскай барацьбы працягвалася на ўзроўні дысертацыйных даследаванняў.*

## Уводзіны

Вывучэнне гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якая адносілася да ліку найбольш распацоўваемых тэм у рэспубліцы, працягвавалася і на працягу 2010–2014 гг. За 5 гадоў айчыннымі навукоўцамі была падрыхтавана пэўная колькасць прац самых разнастайных жанраў, прысвечаных супраціўленню. Разам з тым многія пытанні патрабуюць дадатковага вывучэння. Каштоўную дапамогу навукоўцам у вырашэнні новых задач можа аказаць гістарыяграфічны аналіз праблемы. У шэрагу прац па гістарыяграфіі гэтай тэмы адлюстраваны некаторыя пытанні вывучэння гісторыі Беларусі перыяду акупацыі [1]. Самай значнай працай з'яўляецца манаграфія У.В. Здановіча «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі» [2]. Мэтай дадзеннага артыкула з'яўляецца аналіз апублікаваных гістарыяграфічных крыніц па праблеме, выдадзеных пасля 2010 г.

## Асноўныя накірункі вывучэння гісторыі ўзброенай барацьбы ў тыле германскіх войск

У азначаны перыяд вывучэнне традыцынай для айчыннай гістарыяграфіі партызанскай тэматыкі паднялося на новы ўзровень. Пэўную працу правялі архівісты рэспублікі, якія падрыхтавалі і апублікавалі шэраг зборнікаў дакументаў і даведнікаў [3]. Асобнае месца сярод дакументальных выданняў займае падрыхтаваны сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зборнік «Партизаны в операции “Багратион”», які стаў працягам публікацыі дакументаў, прысвечаных партызанскаму руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, распачатых яшчэ ў 1960-я гг. У выданні прадстаўлены 200 малавядомых дакументаў і матэрыялаў, з якіх толькі 5 былі раней надрукаваны. Размешчаныя ў храналагічна-тэматычным парадку дакументы ўключаюць загады, распараджэнні, дырэктывы, шыфратэлеграмы, радыёграмы, планы, справаздачы, дакладныя запіскі, інфармацыйныя лісты, даведкі, зводкі, данясенні, рапарты і інш. Цікавасць выклікае ужо вядомая даследчыкам «Дырэктыва ЦК КП(б) Беларусі падпольным абкамам і райкамам КП(б)Б, камандзірам, камісарам партызанскіх атрадаў і брыгад аб задачах партызан у сувязі з набліжэннем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Гэты дакумент быў апублікаваны ў пачатку 1980-х гг., але без уступнай часткі, у якой П.К. Панамарэнка адзначае, што «партызанскія атрады і групы разбураюць незадзейнічаныя прадпрымствы, акія знаходзяцца воддаль ад камунікацый, спальваюць дамы,

псуюць абсталяванне і сельгасінвентар, якімі немцы не карыстаюцца …толькі ствараецца бачнасць праведзеных баявых аперацый» [4, с. 74, 75].

Характэрнай асаблівасцю даследаванняў 2010–2014 гг. стала з'яўленне калектыўных выданняў. Так, у 2010 г. айчыннымі гісторыкамі была выдадзена грунтоўная праца у 2 кнігах «Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память», у якой на падставе новых айчынных і замежных крыніц разгледжаны пытанні, недастаткова распрацаваныя ў ранейшыя часы [5]. У першай кнізе ёсць спецыяльны раздзел «Партызанская і падпольная барацьба. Вызваленне рэспублікі», у якім на падставе разнастайных (у тым ліку і замежных) крыніц паказаны планаванне і каардынацыя баявых дзеянняў партызанскіх сіл Беларусі (А.М. Літвін), асабовы склад і кадры партызанскіх фарміраванняў (А.Я. Паўлава), удзел ва ўзброенай барацьбе замежных антыфашыстаў (Э.Ф. Языковіч), баявое ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан (А.А. Крыварот), раскрыты асаблівасці антыгерманскага супраціўлення ў заходніх абласцях Беларусі (А.В. Касовіч), разведвальнай і контрразведвальнай дзейнасці партызан і падпольшчыкаў Беларусі (В.К. Кісялёў).

Гісторыя партызанскай барацьбы раскрыта ў калектыўных выданнях па канкрэтнай праблеме гісторыі Беларусі. Так, у раздзеле III «Беларуская дзяржаўнасць у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны» кнігі 2 фундаментальнага двухтомнага даследавання беларускіх гісторыкаў «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.», выдадзенай у 2012 г., ёсць асобны параграф «Рух антыгерманскага супраціўлення: ідэалагічная і ўзброеная барацьба», падрыхтаваны А.А. Каваленем, М.Г. Жылінскім і У.В. Здановічам [6].

У іншым двухтомным выданні «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг», у прыватнасці, у другой кнізе, цалкам прысвечанай гісторыі Заходняй Беларусі ў часы Другой сусветнай, Вялікай Айчыннай войнаў і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, паказаны працэс станаўлення і развіцця савецкага парызанскага руху, арганізацыйнага афармлення і дзейнасці польскага падполля на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а таксама стасункі паміж савецкімі партызанамі і салдатамі Арміі Краёвай, якія змяніліся з супрацоўніцтва да барацьбы паміж сабой. Аднак нават у перыяд сумеснай барацьбы супраць германскіх акупантаў, як адзначана ў VIII раздзеле «Заходнія вобласці БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны», асноўнай мэтай акаўцаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі «было выратаванне арыштаваных удзельнікаў польскага падполля… Да сучаснага моманту не ўстаноўлена ніводнага факта, калі акаўцы праводзілі б узброеныя дзеянні, якія мелі мэту выратавання жыхаролў беларускіх вёсак» [7, с. 145]. Дадзеныя і іншыя высновы аўтараў падмацаваны архіўнымі дакументамі, змешчанымі ў канцы раздзела.

Значны ўклад у станаўленне і развіццё партызанскага руху ўнеслі супрацоўнікі органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі. Даследаванне гэтай тэммы пачалося ў савецкія часы, аднак большасць выданняў, дысертацыйных прац мелі закрыты характар і былі недаступны для грамадскасці, у тым ліку і навуковай. У постсавецкі перыяд з'явіліся працы (праўда, пераважна папулярна-публіцыстычнага характару), асноўная ўвага ў якіх была сканцэнтравана на негатыўных момантах дзейнасці азначаных органаў, што таксама не набліжае даследчыкаў да ісціны і фарміруе аднабаковы падыход да асэнсавання ролі Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС ) і Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі (НКДБ) у гады Вялікай Айчыннай вайны. Разам з тым супрацоўнікі органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі ваявалі ў партызанскіх атрадах і падполлі, вялі дыверсійна-разведвальную работу ў тыле акупантаў, вялі барацьбу з нацыяналістычным падполлем. Разнастайныя формы ўзброенай барацьбы з нацысцкім агрэсарам на акупіраванай тэрыторыі Беларусі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі доктара гістарычных навук прафесара

кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь А.В. Шаркова «НКВД Беларуси в вооружённой борьбе с нацистским агрессором и националистическим подпольем в годы Великой Отечественной войны» [8]. А.В. Шаркоў – прызнаны спецыяліст па гэтай праблеме: у 1987 г. ім была абаронена кандыдацкая дысертацыя «Деятельность органов внутренних дел Белорусской ССР в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.)», якая, на жаль, мела закрыты характар. У новай працы паказана роля супрацоўнікаў органаў унутраных спраў у станаўленні і развіцці партызанскага руху, забеспячэнні правапарадку ў партызанскіх зонах. Прыведзеныя ў манаграфіі факты сведчаць, што супрацоўнікі ўнутраных спраў, якія валодалі неабходнымі навыкамі і маглі паспяхова вырашаць складаныя задачы ва ўмовах акупацыі, ўнеслі значны ўклад у станаўленне і развіццё партызанскай барацьбы. Асноўнымі накірункамі дзейнасці НКУС з’яўляліся стварэнне партызанскіх атрадаў і невялікіх аператыўных груп, якія засылаліся на акупіраваную тэрыторыю, дыверсійна-баявая, контрразведвальная дзейнасць у тыле ворага, забеспячэнне правапарадку ў партызанскіх зонах. Адзначаючы поспехі першых партызанскіх фарміраванняў, даследчык вызначае і недахопы, якія зніжалі эфектыўнасць іх баявой дзейнасці: фарміраванне атрадаў і груп без уліку спецыфікі раёнаў іх базіравання, адсутнасць у складзе фарміраванняў жыхара ці ўраджэнца мясцін у якіх ім трэба было дзейнічаць, недахоп узбраення, абмундзіравання і харчавання, адсутнасць узаемадзеяння кіраўніцтва НКУС з тэрытарыяльнымі падраздяленнямі і камандаваннем воінскіх часцей.

Высновы А.В. Шаркова сугучны з высновамі супрацоўнікаў Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці І.В. Кеза і В.В. Мароза, аўтараў кнігі «Сквозь годы и грозы ХХ века». Абапіраючыся на разнастайныя дакументы, у тым ліку архівы Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці, аўтары паказваюць не толькі гераізм і мужнасць супрацоўнікаў спецслужб у партызананскай і падпольнай барацьбе на акупіраванай тэрыторыі, але і недахопы і негатыўныя моманты, звязаныя са спецыфікай работы дадзеных органаў. Як адзначаюць даследчыкі, «атрады і групы фарміраваліся ў асноўным бессістэмна, без уліку спецыфікі раёнаў, дзе ім патрэбна было дзейнічаць. Здаралася, што ў складзе асобных партызанскіх атрадаў і аператыўных груп не было ніводнага ўраджэнца ці жыхара той тэрыторыі, на якой давядзецца весці барацьбу з ворагам. Адмоўна адбівалася слабое ўзбраенне, харчаванне і грашовае забеспячэнне. …Мелі месца выпадкі, калі чэкісцкія атрады і групы прымаліся адступаючымі часцямі Чырвонай Арміі за варожых дыверсантаў і падвяргаліся арышту ці раззбраенню» [9, с. 255, 256].

Партызанская тэматыка адлюстравана ў шэрагу артыкулаў. Так, А.М. Літвін разглядае ролю партызанскага фактара ў час падрыхтоўкі і правядзення Курскай бітвы, напярэдадні і падчас Сталінградскай бітвы 1942–1943 гг. і пры вызваленні Беларусі [10]. Як адзначае даследчык, «мерапрыемствы па актывізацыі партызанскага фактару падчас Сталінградскай бітвы па сутнасці прывялі да стварэння ў тыле ворага, другога, партызанскага фронту, што асабліва праявілася летам – восенню 1943 г.» [11, с. 11], а ў перыяд баёў на Курскай дузе «барацьба савецкіх людзей у тыле ворага дасягнула нябачанага раней размаху, стала важным стратэгічным фактарам разгрому ворага» [12, с. 14].

У асобным артыкуле А.М. Літвіна разглядаецца гісторыя падрыхтоўкі і правядзення 16 ліпеня 1944 г. у Мінску мітынгу насельніцтва і параду партызанскіх злучэнняў, прысвечанага вызваленню сталіцы Беларусі ад захопнікаў. У гістарычнай літаратуры гэтая падзея больш вядома як «парад партызан». Аднак у прыведзеным А.М. Літвіным плане правядзення мерапрыемства, падпісаным сакратаром Мінскага абкама КП(б)Б В. Казловым і намеснікам начальніка БПШД Ганенка, у прэамбуле пазначана: «У сувязі з вызваленнем Чырвонай Арміяй сталіцы Беларусі – г. Мінска, правесці 16 ліпеня 1944 года мітынг насельніцтва г. Мінска з удзелам беларускіх партызан». Праве-

дзены навукоўцам аналіз апублікаваных і архіўных крыніц дазволіў яму доказна сцвярджаць, што «мітынгі жыхароў гарадоў і вёсак Беларусі, прысвечаныя вызваленню ад нямецка-фашысцкай акупацыі, былі, з аднаго боку, стыхійнымі праявамі пачуццяў да вызваліцеляў, а з другога – загадзя спланаванымі акцыямі кіраўніцтва рэспублікі, абласных і раённых органаў улады… партызанскія парады сталі для кіраўніцтва рэспублікі пэўнай дэманстрацыяй перад Масквой сілы партызанскага руху, а таксама укладу беларускага народа, беларускіх партызан у вызваленне Беларусі» [13, с. 11].

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на артыкул А.Я. Паўлавай, прысвечаны складанай, па-рознаму ацэньваемай даследчыкамі праблеме ўзаемаадносін партызан з насельніцтвам. Як падкрэслівае даследчык, «створаныя гітлераўцамі ўмовы пакідалі мясцоваму насельніцтву акупаваных тэрыторый не многа варыянтаў: супрацоўнічаць з захопнікамі, ехаць астарбайтарамі ў Нямеччыну або ісці ў лес да партызанаў. У дачыненні да грамадзян, якія выжыдалі, пазіцыя нацыстаў была жорсткай: або супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі, або знішчэнне іх як прыхільнікаў савецкага ладу. Нацыянальным колам і мясцовай інтэлігенцыі нацысты таксама не асабліва давяралі». Адносіны партызан з насельніцтвам шмат у чым вызначаліся асабовым складам атрадаў і брыгад. Усе партызанскія фарміраванні можна падзяліць на мясцовых народных мсціўцаў (паўстанцаў), дыверсантаў і прафесіяналаў. Аргументаванай падаецца і агульная выснова А. Паўлавай, зробленая на падставе архіўных матэрыялаў, што «дакументы ўтрымліваюць прыклады як іх цеснага супрацоўніцтва, так і супрацьстаяння. Вайна завострыла праблемы і канфлікты, якія існавалі на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў. Поспехі народных мсціўцаў наўпрост залежалі ад падтрымкі мірнага насельніцтва. Большая частка канфліктаў мела лакальнае непалітычнае паходжанне. Таму чым больш партызаны ўлічвалі законныя патрэбнасці і інтарэсы мясцовых жыхароў, тым больш значнай была іх падтрымка» [14, с. 84, 91].

Вывучэнне гісторыі ўзброенай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі працягвалася на ўзроўні дысертацыйных даследаванняў. У 2010 г. была абаронена кандыдацкая дысертацыя А.А. Крыварота «Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.)», у якой аўтар удакладніў некаторыя тэрміны, якія склаліся ў савецкай гістарыяграфіі. Так, раней гісторыкамі выкарыстоўвася тэрмін «савецкія партызаны». А.А. Крыварот уводзіць паняцце «беларускія партызанскія фарміраванні», у якое ўключае «баявыя адзінкі партызан, створаныя на тэрыторыі БССР партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі, органамі НКУС БССР з ліку мясцовага насельніцтва, а таксама сумесна сфарміраваныя структурамі КП(б)Б і РСЧА на ўсходзе БССР летам 1941 г. з мясцовых жыхароў і ваеннаслужачыхакружэнцаў, атрады і групы, скамплектаваныя за лініяй фронту структурамі КП(б)Б, органамі НКУС (НКДБ) БССР, якія затым накіроўваліся ў тыл ворага і знаходзіліся ў падпарадкаванні названых стуктур», а таксама тэрмін «расійскія партызаны», які ахоплівае «баявыя адзінкі, якія былі арганізаваны на акупаванай тэрыторыі Арлоўскай, Калінінскай, Смаленскай абласцей і пэўны час дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі; падраздзяленні, створаныя ў тылавых раёнах РСФСР па лініі партыйных, савецкіх і камсамольскіх органаў, падрыхтаваныя структурамі РСЧА, НКУ, (НКДБ) СССР і перакінутыя для баявых дзеянняў на акупаваную тэрыторыю БССР» [15, с. 1].

Характэрнай рысай сучаснай гістарыяграфічнай сітуацыі выступае з'яўленне гістарыяграфічных прац. У 2012 г. выдадзена манаграфія У.В. Здановіча «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі» [16], у якой асобны параграф прысвечаны аналізу прац айчынных гісторыкаў па гісторыі партызанскага руху. Праведзены аналіз паказаў, што партызанская тэматыка займала прыярытэтнае месца ў савецкай гістарыяграфіі. За перыяд 1940–1980-х гг. па гісторыі ўзброенай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі падрыхтаваны фундаментальныя

даследаванні, манаграфіі, зборнікі артыкулаў, дакументаў і ўспамінаў, абаронены кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Айчынныя навукоўцы даследавалі пытанні станаўлення і развіцця партызанскай барацьбы, структуры партызанскіх сіл, стратэгіі і тактыкі баявой дзейнасці, узаемадзеянні партызанскіх фарміраванняў з часцямі Чырвонай Арміі і дапамогі савецкага тылу партызанам, жыцця насельніцтва ў партызанскіх зонах. Характэрнай асаблівасцю гэтых прац была акцэнтацыя на арганізуючую і кіруючую ролю камуністычнай партыі ў зараджэнні і станаўленні партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Разам з тым усебаковае вывучэнне гэтай праблемы стрымлівалася партыйнымі пастановамі, згодна з якімі галоўная роля ў напісанні гісторыі Супраціўлення належала яго кіраўнікам. Замацаванню такіх падыходаў у значнай ступені садзейнічаў і той факт, што доўгі час партыйнае кіраўніцтва Беларусі ўзначальвалі непасрэдныя арганізатары і кіраўнікі ўзброенай барацьбы ў тыле германскіх войск – К.Т. Мазураў і П.М. Машэраў. У постсавецкі перыяд асаблівая ўвага надавалася раскрыццю пытанняў, якія раней не атрымалі належнага асвятлення: дзейнасць Арміі Краёвай, месца каталіцкай і праваслаўнай цэркваў у гісторыі Супраціўлення, узаемаадносіны партызан і насельніцтва, нацыянальна-дэмакратычныя працэсы.

У чацвёртай главе абароненай у 2014 г. кандыдацкай дысертацыі Я.П. Бязлепкіна «Гістарыяграфія ЗША і Вялікабрытаніі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны» разгледжаны асноўныя падыходы амерыканскіх і брытанскіх даследчыкаў да аналізу партызанскай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Адзначаецца, што «з другой паловы 1980-х гг. адбыліся змены ад даследавання савецкага партызанскага руху як канкрэтна-гістарычнай з'явы да аналізу асобных аспектаў партызанскай барацьбы пераважна ў кантэксце сацыякультурнай гісторыі (Б. Шэферд, М. Дзін, Н. Тук). У трэцім перыядзе з'явіліся працы К. Сляпяна, П. Альбана з «патрыятычнай версіяй» узнікнення савецкага партызанскага руху. Большасць прац па тэме савецкага партызанскага руху на тэрытьорыі Белаусі грунтуецца на нямецкіх крыніцах. Іншая пазіцыя характэрна для прац Ц. Малігана, дзе на аснове нямецкіх, савецкіх і беларускіх крыніц (у тым ліку беларускіх даследаванняў) даецца высокая ацэнка ролі партызанскага руху» (як і партызанскіх зон) на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым, падкрэслівае гісторык, «нягледзячы на якасна іншую гістарыяграфічную сітуацыю, у гістарыяграфіі ЗША і Веліакабрытаніі складвання школы беларускіх даследаванняў на інстытуцыйным узроўні не адбылося… для многіх прац сучаснай гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі па гэтай праблематыцы характэрны апісальнасць, аднабаковасць і паверхоўны аналіз» [17. с. 15, 17, 18].

Спецыяльны раздзел «Вклад Беларуси в победу над фашизмом в отражении документов национального архивного фонда, отечественной и зарубежной историографии» ёсць у другой частцы двухтомнага выдання «Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память». У артыкулах У.В. Здановіча, С.Я. Новікава, Я.П. Бязлепкіна раскрываюцца дасягненні і вызначаюцца нявырашаныя пытанні беларускай праблематыкі 1941–1945 гг. у айчыннай, германскай і англамоўнай гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі [18].

**Заключэнне**

Аналіз літаратуры і дысертацыйных прац паказвае, што айчынныя гісторыкі зрабілі важкі крок у вывучэнні партызанскага руху. Адметнай асаблівасцю гістарыяграфіі гісторыі ўзброенай барацьбы ў тыле акупантаў азначанага перыяду стала павелічэнне крыніцазнаўчай базы, з'яўленне калектыўных выданняў, асобных раздзелаў па вылучанай праблеме ў калектыўных выданнях па канкрэтнай праблеме гісторыі Беларусі. Для гістарыяграфічнай сітуацыі 2010–2014 гг. характэрнай рысай выступае з'яўленне гістарыяграфічных прац. Новыя факты і аспекты партызанскай барацьбы знайшлі адлюстраванне ў шэрагу артыкулаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 2. – 358 с., Крыварот, А. А. Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Крыварот ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – 27 с., Бязлепкін, Я. П. Гістарыяграфія ЗША і Вялікабрытаніі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.09 / Я. П. Бязлепкін; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2014. – 25 с.

2. Здановіч, У. В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі : манаграфія / У. В. Здановіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2012. – 283 с.

3. Пантелеймон Пономаренко: личный архив и книжное собрание : сводный каталог / Департамент по архивам и делопроизводству [и др.] ; сост.: В. В. Скалабан (рук.) [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Звязда, 2013. – 256 с.; История 4-й Белорусской партизанской бригады ; сост.: Н. В. Воронова [и др.]; редкол.: В. А. Космач [и др.]. – Минск : НАРБ, 2010. – 162.

4. Партизаны в операции «Багратион» : документы и материалы / Департамент по архивам и делопроизводству [и др.] ; сост.: Н. А. Денисова [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Нац. библиотека, 2014. – 412 с.

5. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 1. – 480 с.

6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI стст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Кн. 1. – 584 с.; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI стст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Кн. 2. – 654 с.

7. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2014. – Кн. 2. – 335 с.8. Шарков, А. В. НКВД Беларуси в вооружённой борьбе с нацистским агрессо-ром и националистическим подпольем в годы Великой Отечественной войны / А. В. Шарков ; М-во внутренних дел Респ. Беларусь, Акад. М-ва внутренних дел Респ. Беларусь. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2012. – 277 с. 7

9. Кез, И. В. Сквозь годы и грозы XX в. / И. В. Кез, В. В. Мароз. – Брест : Альтернатива, 2014. – 384 с.

10. Літвін, А. Аператыўнае выкарыстанне партызанскіх сіл Беларусі ў інтарэсах фронту ў час падрыхтоўкі і правядзення Курскай бітвы / А. Літвін // Беларус. гіст. часопіс. – 2013. – № 9. – С. 5–14; Літвін, А. Актывізацыя партызанскага фактару як складаючай часткі савецкай стратэгіі вядзення вайны напярэдадні і падчас Сталінградскай бітвы 1942–1943 гг. / А. Літвін // Беларус. гіст. часопіс. – 2013. – № 2. – С. 4–12; Литвин, А. Операция «Багратион». Встречный фронт / А. Литвин // Беларус. думка.– 2014. – № 6. – С. 13–20; Литвин, А. Операция «Багратион». Встречный фронт / А. Литвин // Беларус. думка.– 2014. – № 7. – С. 32–39.

11. Літвін, А. Актывізацыя партызанскага фактару як складаючай часткі савецкай стратэгіі вядзення вайны напярэдадні і падчас Сталінградскай бітвы 1942–1943 гг. / А. Літвін // Беларус. гіст. часопіс. – 2013. – № 2 – С. 4–12.

12. Літвін, А. Аператыўнае выкарыстанне партызанскіх сіл Беларусі ў інтарэсах фронту ў час падрыхтоўкі і правядзення Курскай бітвы / А. Літвін // Беларус. гіст. часопіс. – 2013.– № 9. – С. 5–14.

13. Літвін, А. Трыумф няскоранай Беларусі : да 70-годдзя партызанскага параду 1944 года ў Мінску / А. Літвін // Беларус. гіст. часопіс. – 2014. – № 9. – С. 4–11.

14. Павлова, Е. Многогранье всенародной борьбы. Отношения партизан с местным населением / Е. Павлова // Беларус. думка. – 2014. – № 2. – С. 82–91.

15. Крыварот, А. А. Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Крыварот ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – 27 с.

16. Здановіч, У. В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі : манаграфія / У. В. Здановіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2012. – 283 с.

17. Бязлепкін, Я. П. Гістарыяграфія ЗША і Вялікабрытаніі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.09 / Я. П. Бязлепкін ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2014. – 25 с.

18. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 2. – 358 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 27.05.2015

***Zdanovich V.V.*** **Guerrilla Movement on the Territory of Belarus during the Great Patriotic war in the Writings of Modern Belarusian Researchers (2010–2014)**

*The article deals with the study of guerrilla movement in the given period. It is shown that in the research of this issue great results have been achieved. The base of source study has been widen, collective publications have appeared where you can find special chapters devoted to armed struggle of the population on the occupied territory of Belarus. This issue was analyzed in monographs and a number of articles. History studies of guerrilla struggle continued in dissertation research.*

***Артыкул падрыхтаваны ў рамках навукова-даследчай працы Беларускага фонда фундаментальных даследаванняў Г 15-065 «Антыгерманскае супраціўленне на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі».***